УДК 908 (476)

Л.Ф. Шорац

# Школьнае гістарычнае краязнаўства Беларусі ў 20–30-я гады ХХ ст.

Ва ўмовах пераходу ад грамадзянскай вайны да грамадзянскага міру Камуністычная партыя і савецкае кіраўніцтва павінны былі перайсці да абнаўлення сваёй нацыянальнай палітыкі, што ў дачыненні да Беларусі знайшло сваё адлюстраванне ў палітыцы беларусізацыі. Адным з яе накірункаў стала перабудова сістэмы школьнай адукацыі. У яе аснову была пакладзена сямігадовая працоўная школа з двумя канцэнтрамі. Адначасова са зменай структуры школьнай адукацыі ставілася задача з дапамогай разнастайных метадаў навучання, у тым ліку і краязнаўства, сфарміраваць у моладзі любоў і павагу да роднай культуры і мовы, гісторыі і традыцый беларускага народа. Менавіта таму краязнаўства было уключана ў школьныя праграмы, пачалася праца па выпрацоўцы методыкі краязнаўчай працы, стварэнні школьных краязнаўчых гурткоў, раённых і акруговых таварыстваў. Агульнае кіраўніцтва краязнаўчым рухам было ўскладзена на Цэнтральнае Бюро Краязнаўства (ЦБК), створанае 1 студзеня 1924 г. на правах пастаяннай камісіі Інстытута Беларускай Культуры.

ЦБК, каб вырашыць арганізацыйныя пытанні, наладзіць жывую сувязь с краязнаўчымі арганізацыямі, накіравала ім у дапамогу сваіх прадстаўнікоў, адозвы, інструкцыі, анкеты, праекты статутаў, наладзіла выданне спецыяльнага часопіса – «Наш край», на старонках якога прапагандаваліся ідэі краязнаўства, змяшчаліся парады, метадычныя распрацоўкі, друкаваліся справаздачы аб працы краязнаўчых арганізацый.

З мэтай павышэння эфектыўнасці школьнага гістарычнага краязнаўства рашэннем Прэзідыума ЦБК 13 кастрычніка 1926 г. была створана Школьная Краязнаўчая Камісія, у склад якой ад ЦБК увайшлі М. Каспяровіч і Г. Аляксандраў [1]. Адпаведна пры акруговых і раённых краязнаўчых таварыствах былі ўтвораны школьна-краязнаўчыя секцыі. Праведзеная праца дала свае станоўчыя вынікі. Краязнаўчы рух на Беларусі ўвогуле, у тым ліку і школьнае гістарычнае краязнаўства набылі масавы характар. На пачатак 1928 г. у краязнаўчай працы ў рэспубліцы прымалі ўдзел больш за 10 тыс. чалавек супраць 9637 і 4314 у 1927 г. і 1926 г. адпаведна. У БССР дзейнічала 301 краязнаўчая арганізацыя, у тым ліку 8 акруговых, 100 раённых таварыстваў, 193 краязнаўчыя гурткі. З агульнай колькасці ўдзельнікаў краязнаўчага руху 87% складалі настаўнікі і вучні. Пры непасрэдным удзеле школьных краязнаўцаў толькі за 1927 г. было сабрана звыш за 62,3 тыс. картак-слоў, 18,3 тыс. фальклорных запісаў, 98 калекцый, зроблена 207 апісанняў, запоўнена 446 анкет, сабрана свыш 1 тыс. іншых матэрыялаў, праведзена 68 экскурсій. Былі выдадзены краязнаўчыя зборнікі «Магілёўшчына», «Горацкі раён», надрукаваны Барысаўскі і Смалявіцкі раённыя краязнаўчыя часопісы, здадзена ў друк другая частка зборніка «Віцебшчына», падрыхтаваны да друку школьна-краязнаўчая хрэстаматыя «Магілёўшчына», зборнікі «Полаччына», «Гомельшчына», «Міншчына», «Бабруйшчына» і «Мазыршчына» [2–3].

Плённа працаваў краязнаўчы гурток пры Уздзенскай сямігодцы Мінскай акругі. Ён налічваў у сваім складзе 70 членаў. Агульныя сходы гуртка

адбываліся штотыднёва. На кожным сходзе чыталіся даклады інфармацыйнага характару, вызначаліся канкрэтныя заданні для кожнага члена гуртка. Такі падыход да арганізацыі працы даў станоўчыя вынікі. Члены гуртка разгарнулі шырокую працу па зборы матэрыялаў аб паўстанні 1863 г., рэвалюцыйных падзеях 1905 г. на Уздзеншчыне, гістарычным апісанні вёсак. Вынікі працы членаў гуртка змяшчаліся на старонках школьнага рукапіснага часопіса «Вір» [4]. Сярод краязнаўчых гурткоў прыкметна сваёй зацікаўленасцю да краязнаўчай працы выдзяляўся гурток пры Мінскай 4-й Савецкай сямігадовай школе. Зместам краязнаўчай працы вучняў школы стала даследаванне прамысловасці г. Мінска і бліжэйшых пасёлкаў. Вучні зрабілі апісанне мылаварнага, ганчарнага, шкіпінарнага, смалакурнага заводаў. Зробленыя апісанні, а таксама матэрыялы, якія тычыліся шлюбных звычак яўрэяў, свят татараў, іх гісторыі, былі надрукаваны на старонках школьнага краязнаўчага часопіса «Наш край». У школьна-краязнаўчым часопісе друкаваліся толькі тыя матэрыялы, якія былі прызнаны найбольш каштоўнымі і апрацаванымі. Незакончаныя працы размяшчаліся на старонках «Архіва» краязнаўчага гуртка. Адзначаныя поспехі краязнаўчага гуртка ў многім тлумачацца добрым кіраўніцтвам з боку настаўніка М.Я. Валасевіча, які працаваў з вучнямі з 1923 г., падтрымкай дырэктара школы А.М. Станкевіча, які забяспечыў фінансаванне яго дзейнасці [5]. Стварыць школьны краязнаўчы музей у бліжэйшы час – такое рашэнне прынялі сябры гуртка Асіповіцкай чыгуначнай школы. Была абрана музейная камісія ў складзе Г. Акановіча, Н. Рэменя, В. Сідарчука, А. Шафраноўскага. Камісія клапацілася аб зборы матэрыялаў для музея, яго сістэматызацыі. Да працы былі прыцягнуты не толькі вучні, але і выпускнікі школы – Альховік, Гміра, Ляхоўскі. Аддзел адукацыі Заходніх чыгунак выдзеліў на арганізацыю музея 60 рублёў. Былі закуплены неабходныя матэрыялы, складзена экспазіцыя. У аддзеле побыту былі размешчаны ўзоры тканін, коўганка, мадэлі сельскагаспадарчых прылад, апісанні кірмашоў, планы вёсак, хат, якія былі зроблены пад час экскурсій. Экспазіцыя культурна-гістарычнага аддзела складалася з фотаздымкаў, якія адлюстроўвалі гісторыю Асіповіч з пачатку XX стагоддзя, з грашовай калекцыі, каменных сякер і скрабкоў, знойдзеных на тэрыторыі Ясеньскага сельсавета і Жужлянскага гарадзішча, у вусці ракі Сіняй. Рукамі гуртkоўцаў былі створаны макеты Зборскага і Жужлянскага гарадзішч. Адначасова з працай па стварэнні музея члены гуртка прынялі актыўны ўдзел у апісанні раёна. Сабраны матэрыял быў выкарыстаны пры падрыхтоўцы да друку краязнаўчага апісання «Асіповіцкі раён». Частка матэрыялаў, сабраных членамі гуртка, была размешчана ў школьным рукапісным часопісе «Наш раён». У кожным яго нумары друкаваліся таксама матэрыялы аб новых экспанатах, набытых для музея, давалася хроніка працы краязнаўцаў, справаздачы аб экскурсіях, планы працы. Кожны артыкул быў ілюстраваны фотаздымкамі, планамі, замалёўкамі [6].

Аднак у другой палове 1920-х гг. выкананне рашэнняў, якія тычыліся разгортвання краязнаўства, у тым ліку і школьнага гістарычнага, станавілася ўсё больш праблематычным. Работа краязнаўцаў праходзіла ў формах дэмакратычнай самадзейнасці, самаарганізацыі жыцця, што не адпавядала курсу на бюракратызацыю грамадскага жыцця, які быў узяты ва ўмовах фарміравання культу асобы Сталіна. Як вынік, ад краязнаўчых арганізацый патрабуюць змяніць прыярытэты ў працы: замест гісторыка-этнаграфічнага ўхілу акцэнт перанесці на вывучэнне сучаснасці, гаспадарчага і эканамічнага становішча горада і вёскі. У выступленнях на краязнаўчых канферэнцыях дзяржаўных і палітычных дзеячаў, публікацыях у перыядычным друку краязнаўцы абвінавачваюцца ў нацдэмаўшчыне, польскім нацыянал-фашызме, скажэнні

марксісцка-ленінскай ідэалогіі. Вось як, напрыклад, было сказана пра працу краязнаўцаў у 20-я гады XX ст. на старонках першага нумара часопіса «Савецкая краіна» – афіцыйнага органа ЦБК з лістапада 1930 г.: «ЦБК пры БАН не ў прыклад іншым інстытыцыям – замкнутым, нямасавым – было трыбунай для масавай прапаганды контррэвалюцыйнай справы сярод вясковай інтэлігенцыі, студэнцкай і вучнёўскай моладзі і інш. праз мясцовыя краязнаўчыя таварыствы... У абсалютнай большасці краязнаўчыя арганізацыі знаходзіліся пад уплывам нацдэмаў, праводзілі варожую рабочаму класу лінію» [7]. У сувязі з адзначаным пачаліся арышты актыўных удзельнікаў краязнаўчага руху. АДПУ былі арыштаваны: тры былыя члены ўрада БССР, якія мелі непасрэднае дачыненне да разгортвання краязнаўчага руху ў 1920-х гг. – наркам працы, гісторык і пісьменнік, удзельнік І Усебеларускага краязнаўчага з'езда В.Л. (Язэп) Дыла, наркам асветы А.В. Баліцкі, наркам земляробства – Дз.Ф. Прышчэпаў; актыўныя ўдзельнікі і арганізатары краязнаўчай працы – У.І. Пічэта, М.В. Азбукін, В.Ю. Ластоўскі, М.І. Каспяровіч, А.А. Шлюбскі, С.М. Мялешка, С.М. Некрашэвіч, П. Пяцэвіч, М.А. Ламака, М.М. Улашчык, Я.І. Васілевіч і іншыя [8].

Адначасова была абвешчана пераарыентацыя краязнаўчай працы на выкананне непасільных задач: даследаванне прыродных багаццяў, барацьбу за рацыянальнае і эфектыўнае іх выкарыстанне, рацыяналізацыю вытворчасці і г.д. Пачалася рэарганізацыя кіруючых органаў краязнаўчага руху. Пастановай Прэзідыума Беларускай Акадэміі навук ад 13 жніўня 1930 г. былі ліквідаваны акруговыя таварыствы краязнаўства. Замест аўтарытэтных вучоных у склад ЦБК былі прызначаны асобы, якія мелі пераважна вопыт партыйнай ці дзяржаўнай работы. Так, старшынёй ЦБК стаў В.С. Серафімаў, а навуковым сакратаром – В.А. Самцэвіч. 1 чэрвеня 1932 г. СНК БССР прыняў спецыяльную пастанову «Аб мерапрыемствах па разгортаванню краязнаўчага руху», у якой перад ЦБК, мясцовымі краязнаўчымі арганізацыямі была пастаўлена задача падпарадкаваць працу краязнаўцаў канкрэтным задачам сацыялістычнага будаўніцтва, узмацніць краязнаўчую працу ў школах, разгарнуць падрыхтоўку настаўнікаў-краязнаўцаў праз курсы і канферэнцыі. Выконваючы патрабаванні СНК БССР, ЦБК разам з НКА БССР распрацавалі «Кароткую праграму краязнаўчай падрыхтоўкі настаўніка масавай школы». Былі праведзены даследаванне і інструктаж па разгортаванні краязнаўчай працы ў Койданаўскім, Дубровенскім, Аршанскім, Шклоўскім, Рагачоўскім, Жлобінскім, Лёзненскім, Суражскім і Гарадоцкім раёнах, абвешчаны двухтыднёвік агляду краязнаўчай працы [9]. Аднак справа па разгортванні краязнаўчага руху на месцах, наданні яму адпаведнага накірунку рухалася марудна. Распрацаваныя мерапрыемствы не выконваліся, сітуацыю спрабавалі выправіць з дапамогай адміністрацыйных мер. У жніўні 1932 г., напрыклад, стан краязнаўчай працы быў разгледжаны на пасяджэнні сакратарыята Аршанскага РК КП(б)Б. Пад час абмеркавання сакратарыят прыйшоў да высновы – Аршанскае раённае краязнаўчае бюро, нягледзячы на наяўнасць двух штатных супрацоўнікаў, бяздзейнічае. Рашэннем сакратарыята краязнаўчае бюро было распушчана, а справа перададзена на разгляд РКК і РСІ [10].

Меры далі пэўныя вынікі, але яны не адпавядалі намечаным планам. Так, на канец 1932 г. у БССР дзейнічалі толькі 43 раённыя бюро краязнаўства, 103 краязнаўчыя ячэйкі, у тым ліку 46 пры школах [11]. Лічбы сведчаць, што краязнаўчы рух паступова ішоў на спад. У наступны час пасля шэрага рэарганізацый ЦБК было распушчана, перастаў выдавацца і часопіс «Савецкая краіна». Кіраўніцтва краязнаўчай працай перайшло да НКА БССР. 17 лютага 1937 г. СНК БССР выдаў пастанову «Аб развіцці музейнай і краязнаўчай

справы БССР». Адзначыўшы, што краязнаўчыя арганізацыі не змаглі адолець задачы вывучэння прыродных багаццяў, СНК БССР запатрабаваў перабудаваць працу краязнаўчых арганізацый у плане забеспячэння сувязі з канкрэтнымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. Прадугледжвалася наступная пабудова краязнаўчых арганізацый: краязнаўчыя ячэйкі на прадпрыемствах, саўгасах і калгасах, школах і ўстановах; пры раённых і акруговых цэнтрах – раённыя і акруговыя бюро. Пастанова прадугледжвала дапамогу школьным краязнаўчым арганізацыям з боку адміністрацыі школ [10, Ф. 175. Воп. 1. Спр. 11. Л. 1–3]. Аднак, 25 красавіка 1938 г. НКА СССР лістом-дырэктывай «Аб пастаноўцы і арганізацыі краязнаўчай работы давёў да ведама, што няма ніякай патрэбы ў стварэнні спецыяльных і асобных краязнаўчых арганізацый. Было прадпісана ўсю працу праводзіць пад навукова-метадычным кіраўніцтвам мясцовых музеяў.

Такім чынам, праведзены аналіз дае магчымасць выдзеліць у развіцці школьнага гістарычнага краязнаўства два перыяды: першы – 1920-я гады – час, калі краязнаўчы рух набыў масавы характар. Краязнаўства разглядалася як грунт агульнаадукацыйнай школы, як сродак набліжэння адукацыі і выхавання да жыцця. Быў назапашаны станоўчы вопыт мэтанакіраванага комплекснага вывучэння рэгіёнаў, адміністрацыйных адзінак, асобных населеных пунктаў. На мяжы 1920–1930-х гг. пачынаецца другі перыяд, пад час якога краязнаўчы рух страчвае свой грамадскі характар і прыстасоўваецца да патрэб адміністрацыйна-каманднай сістэмы.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***НАН Рэспублікі Беларусь. Цэнтральны навуковы архіў.*** Ф. 67. Воп. 1. Арх. № 16. Л. 30.
2. ***Справаздача Цэнтральнага Бюро краязнаўства*** // Наш край, 1928, № 5. – С. 58, 59.
3. ***Працы Другога Усебеларускага Краязнаўчага З'езду.*** 10–13 лютага 1927 г. – Мн., 1927. – С. 18.
4. ***Краязнаўчы гурток пры Уздзенскай сямігодцы*** // Наш край, 1927, № 8–9. – С. 81.
5. ***Выстаўка прац краязнаўчага гуртка пры Мінскай 4-й Савецкай сямігадовай школе*** // Наш край, 1928, № 6–7. – С. 86–87.
6. ***Музей Асіповіцкай чыгуначнай школы*** // Наш край, 1929, № 4. – С. 63–64.
7. ***Садоўскі Ф.П.*** «Савецкая краіна» – барацьбіт за савецкае краязнаўства; ***Серафімаў В.*** За савецкае краязнаўства // Савецкая краіна, 1931, № 1–2. – С. 3, 6.
8. ***Гужалоўскі А.А.*** Музеі Беларусі (1918–1941 гг.). – Мн., 2002. – С. 93–94.
9. ***Хроніка*** // Савецкая краіна, 1932, № 10. – С. 110–111.
10. ***Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці.*** Ф. 2. Воп. 1а. Спр. 109. Л. 108–109.
11. ***Хроніка*** // Савецкая краіна, 1933, № 1. – С. 79.



## *SUMMARY*

*The article deals with the process of establishment and developing of school historic local lore studies in Belarus in 1920's, its role in organizing the training and education of schoolchildren. The article shows how in 1930's the local lore studies movement loses its social character and adapts to the needs of the administrative order system.*



*Поступила в редакцию 30.08.2005*